**УДК 39(476-22)(091)+316.343:63-051(476)(091)** **DOI 10.52928/2070-1608-2026-79-3-63-66**

# КАНФЛІКТ ЗВЫЧАЁВЫХ ПРАКТЫК І ПРАВАВЫХ НОРМАЎ У ПАСЛЯВАЕННАЙ БЕЛАРУСКАЙ ВЁСЦЫ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ СУДОВЫХ СПРАЎ, КАЛГАСНЫХ ПРАТАКОЛАЎ І ЭТНАГРАФІЧНЫХ КРЫНІЦ)[1]

***канд. гіст. навук, дац. А.В. СУМКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай)***
***ORCID: https://orcid.org/0000-0002-9940-0236***

*Разглядаюцца канфлікты паміж традыцыйнымі звычаёвымі практыкамі і прававымі нормамі ў пасляваеннай беларускай вёсцы на падставе аналізу судовых спраў, калгасных пратаколаў і этнаграфічных крыніц. Крыніцы сведчаць пра неаднязначнасць кваліфікацыі аднолькавых дзеянняў сялян на ўзроўні калгаснай грамады і праваахоўных органаў. Паказана, што рэлігійна-абрадавыя і патрыярхальна-сямейныя практыкі працягвалі рэгуляваць паводзіны вяскоўцаў і ўступалі ў супярэчнасць з дзяржаўнымі прававымі навацыямі (Указы 1947 – 1948 гг.) у сферах землекарыстання, працоўнай дысцыпліны і сямейных адносін. Трансфармацыя традыцыйнай культуры разглядаецца як працэс, у якім звычаі прыстасоўваліся да новых сацыяльна-эканамічных умоў, захоўваючы знешнюю форму.*

***Ключавыя словы:*** *пасляваенная вёска, прававое рэгуляванне, традыцыйная культура, сялянскі светапогляд.*

**Уводзіны.** У кантэксце трансфармацыйных працэсаў у культуры беларусаў другой паловы ХХ ст. асаблівую цікавасць уяўляе пасляваенны перыяд – час не толькі матэрыяльнага аднаўлення гаспадаркі, але і істотнай змены сістэмы сацыяльнага рэгулявання на вёсцы. Аграрная палітыка дзяржавы ў 1946–1948 гг. знайшла адлюстраванне ў шэрагу заканадаўчых актаў, накіраваных на ўзмацненне кантролю над сельскагаспадарчай вытворчасцю і паводзінамі сялянства. Гэтыя акты распрацоўваліся на агульнасаюзным узроўні, а органы ўлады і кіравання рэспублікі вызначалі канкрэтныя меры па іх рэалізацыі. Аднак пры гэтым захоўваўся разрыў паміж фармальнымі прававымі нормамі, якія дзяржава імкнулася зрабіць універсальнымі, і традыцыйнымі сацыяльнымі практыкамі, якія працягвалі рэгуляваць паводзіны сялян.

Мэта артыкула – на падставе судова-следчых матэрыялаў, калгасных пратаколаў і этнаграфічных крыніц разгледзець канфлікты паміж традыцыйнымі звычаёвымі практыкамі і прававымі нормамі ў пасляваеннай беларускай вёсцы, а таксама выявіць, якім чынам адбывалася ўзаемадзеянне гэтых дзвюх сістэм рэгуляцыі ў канкрэтных жыццёвых сітуацыях.

Тэарэтыка-метадалагічнай асновай даследавання з'яўляецца канцэпцыя мадэрнізацыі, якая найбольш падыходзіць для разумення трансфармацыйных працэсаў у беларускай вёсцы. Як паказвае С.М. Ходзін у манаграфіі “Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі”, важнейшымі складнікамі традыцыйнага сялянскага светапогляду з’яўляліся праца, зямля і вера [1]. Для разумення пасляваенных канфліктаў паміж звычаём і законам важна ўлічваць выснову аўтра аб тым, што сельскі свет у міжваенны перыяд, нягледзячы на ўсе захады дзяржавы, не быў канчаткова расколаты: элементы адносін, сфарміраваных у грамадзе, традыцыйныя інстытуты працягвалі дзейнічаць [1, с. 227]. Мадэрнізацыйныя працэссы былі перарваны Вялікай Айчыннай вайной, якая ўзмацніла ролю традыцыйных механізмаў самарэгуляцыі. Пры гэтым ужо з пачатку 1930-х гг., з узмацненнем дзяржаўнага рэгулявання ў аграрнай сферыназіраўся аб’ектыўны канфлікт паміж мясцовымі звычаямі і агульнадзяржаўнымі нарматывамі. У пасляваенны час задача забеспячэння харчавання краіны патрабавала яшчэ большага кантролю над сельскагаспадарчай вытворчасцю, што знайшло адлюстраванне ва Указах 1947 – 1948 гг. Аднак іх рэалізацыя на мясцовым узроўні выявіла супярэчнасці: сяляне працягвалі прытрымлівацца традыцыйных форм гаспадарання, якія не заўсёды супадалі з фармальнымі прававымі нормамі. Гэта прыводзіла да сітуацый, калі адзін і той жа ўчынак мог атрымаць розную ацэнку – ад “рэлігійнага перажытку” да “крадзяжу”, у залежнасці ад таго, на якім узроўні і кім ён разглядаўся.

Метадалагічна даследаванне грунтуецца на прынцыпах мікрагісторыі і гісторыі паўсядзённасці, якія дазваляюць праз аналіз канкрэтных судовых спраў рэканструяваць карціну свету і матывацыю паводзінаў сялянства.

У якасці крыніц выступаюць судова-следчыя матэрыялы, пратаколы калгасных сходаў, дакументы мясцовых органаў улады, этнаграфічныя матэрыялы.

**Асноўная частка.** Сялянскі светапогляд у пасляваенны перыяд, нягледзячы на рэгіянальныя і сацыяльна-эканамічныя адрозненні беларускай вёскі, захоўваў агульныя асновы, якія канкрэтызаваліся ў трываласці звычаёвых практык, патрыярхальным сямейным ладзе і ўспрыманні зямлі як асновы выжывання. Менавіта гэтыя ўстойлівыя рысы вызначалі рэакцыю сялянства на дзяржаўныя навацыі. Пры гэтым, як паказвае С.М. Ходзін, ужо ў 1920-я гг. у паўсядзённым жыцці вёскі з’яўляліся рысы новага ўкладу, паступова змянялася свядомасць сялян, выпрацоўваліся новыя светапоглядныя арыентацыі. Аднак гэтыя змены не азначалі поўнага разрыву

[1] Артыкул падрыхтаваны ў межах выканання тэмы ГБ 1926 «Святочна-абрадавая культура і фальклор беларусаў Падзвіння ў другой палове ХХ – пачатку ХХІ ст.».

з традыцыяй, яны, хутчэй, накладаліся на яе, ствараючы складанае спалучэнне старога і новага, якое ў пасляваенны час выявілася ў канфліктах паміж звычаёвымі практыкамі і прававымі навацыямі.

Адным з вызначальных фактараў, якія абумовілі стан пасляваеннай вёскі, сталі наступствы Вялікай Айчыннай вайны. Яны былі катастрафічнымі для ўсёй Беларусі. У "Спісе сельскіх населеных пунктаў Беларусі, знішчаных нямецкімі акупантамі і іх пасобнікамі цалкам і часткова", падрыхтаваным супрацоўнікамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, змешчана інфармацыя пра 10 586 сельскіх населеных пунктаў [2, с. 9]. Генеральная пракуратура Беларусі праводзіць улік пацярпелых населеных пунктаў, у якіх была знішчана хаця б адна хата. Згодна з гэтым улікам на 1 ліпеня 2025 г. у Беларусі пацярпела, было знішчана цалкам і часткова 12 868 сельскіх населеных пунктаў [2, с. 9]. Розніца ў лічбах тлумачыцца рознымі крытэрыямі падліку: спіс НАРБ улічвае цалкам знішчаныя паселішчы; да часткова знішчаных аднесены тыя, у якіх было знішчана не менш за 25% жыллёвага фонду або 20 і больш дамоў, незалежна ад іх агульнай колькасці [3, с. 10]. На сённяшні час праца па ўдакладненні сабранай інфармацыі працягваецца.

Чалавечыя і матэрыяльныя страты, скарачэнне пасяўных плошчаў і падзенне ўраджайнасці адмоўна адбіліся на стане пасляваеннай вёскі. Сітуацыю ўскладнялі неўрадлівыя гады, якія прывялі да вострага дэфіцыту харчавання. У гэтых умовах дзяржава вымушана была ўзмацніць кантроль над размеркаваннем прадуктаў і спыніць крадзяжы, якія набылі значныя памеры. Рэакцыяй на сітуацыю ў краіне стаў Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 4 чэрвеня 1947 г. "Аб адказнасці за раскраданне сацыялістычнай маёмасці". Паводле даных пракуратуры па Віцебскай вобласці большасць спраў, узбуджаных па гэтым Указе, была звязана з дробнымі крадзяжамі падчас уборкі ўраджаю[2].

Матэрыялы судова-следчых органаў сведчаць аб тым, што не заўсёды неспрыяльная жыццёвая сітуацыя станавілася прычынай падпадання сялян пад дзеянне Указа ад 4 чэрвеня 1947 г.. У шэрагу выпадкаў сістэма каштоўнасцей і карціна свету вяскоўцаў не супадала з сістэмай каштоўнасцей уладнай вертыкалі і новай культурнай мадэлью. Крыніцы сведчаць аб тым, што рэакцыя на адзін і той жа ўчынак у пасляваеннай вёсцы была неадназначнай. Характэрны выпадак адбыўся з жанчынай, якая была асуджана па артыкуле 3 Указа за крадзеж аднаго снапа калгаснага жыта. З матэрыялаў справы вынікала, што жанчына ў першы дзень жніва ўзяла пры ўсіх так званыя "зажынкі" – сноп жыта і паставіла яго перад іконай у сваёй хаце[3]. У традыцыйнай сялянскай культуры жніво ўспрымалася як найважнейшы этап гадавога цыклу, які падводзіў вынік усёй шматдзённай працы. Пачатак і заканчэнне ўборкі ўраджаю здаўна ўрачыста адзначаліся не толькі ў кожнай сям'і, але і ўсёй сельскай грамадой. У першы дзень жніва жнеі апраналіся ў чыстае адзенне, збіраліся і ішлі на ніву хутка, бо, лічылася, што гэта спрыяе хуткаму выкананню жніўных работ. Па дарозе зажынальніцы, а гэта былі гаспадыня з дачкамі і нявесткамі, асцерагаліся, каб ніхто не перайшоў дарогу. У некаторых месцах першы сноп, які называўся "гаспадар-сноп", жала гаспадыня, у іншых – яе дочкі і нявесткі. Зажыначны сноп захоўваўся ў кожнай сялянскай хаце на покуце да дажынак [4, с. 508].

Гэтае дзеянне, якое ў традыцыйнай сістэме каардынат мела сакральны сэнс, у новай нарматыўнай сістэме атрымала прынцыпова іншую інтэрпрэтацыю. На ўзроўні індывідуальнага светапогляду жанчына захоўвала традыцыйную мадэль паводзінаў, дзе рытуал быў абавязковым элементам гаспадарчага цыклу, а само дзеянне не было крадзежам у яе ўласнай сістэме каштоўнасцей. Яна дзейнічала як захавальніца звычаю, які рэгуляваў адносіны чалавека з зямлёй і грамадой на працягу стагоддзяў. Аднак у пасляваенны час гэтая традыцыя сутыкнулася з новымі рэаліямі калгаснай вытворчасці. Зямля страціла статус "сваёй", а сноп – сваё сакральнае значэнне. Як сведчаць палявыя этнаграфічныя матэрыялы, у калгасных умовах "зажынкі" не зніклі, але трансфармаваліся: галоўнымі выканаўцамі сталі не жанчыны-гаспадыні ў коле сям'і, а працоўныя брыгады. Адна з рэспандэнтак узгадвала, што падчас збору ўраджая святочна прыбраныя жанчыны зразалі некалькі небальшэнькіх снапоў жыта і адзін з іх аднасілі ў праўленне калгасу[4]. Рытуал захоўваў сваю знешнюю форму, але яго адрасат змяніўся: першы сноп перадавалі не гаспадару поля, які ён ставіў на покуць, а старшыні калгаса. Гэта сведчыць аб тым, што калгасная грамада пастунова пераасэнсоўвала традыцыйныя звычаі, надаючы ім новае, "савецкае" гучанне.

Рэакцыя на ўчынак жанчыны была неадназначнай. На ўзроўні калгаснай грамады гэты ўчынак быў асуджаны як "рэлігійны перажытак", але грамада не ініцыявала крымінальнага пераследу. Гэта сведчыць аб тым, што калгаснікі ўжо інтэрналізавалі новую ідэалогію (што пацвярджае факт асуджэння), аднак захоўвалі элементы традыцыйнай салідарнасці, якія не дапускалі перадачы аднавяскоўца ў рукі праваахоўнай сістэмы. Грамада выконвала функцыю "фільтра", які пераўтвараў абрадавае дзеянне ў ідэалагічны казус, але не дазваляў яму стаць юрыдычным. На ўзроўні праваахоўных органаў выявілася ўнутраная разнастайнасць новай сістэмы. Міліцыя настойвала на поўным прымяненні Указа ад 4 чэрвеня 1947 г., кваліфікуючы ўчынак як крадзеж сацыялістычнай маёмасці. Аднак пракуратура, правёўшы праверку, вызваліла жанчыну ад адказнасці. Гэта дэманструе, што нават у межах дзяржаўнага апарату існавалі розныя падыходы да таго, як узаемадзейнічаць з традыцыйнымі практыкамі.

Такім чынам, разгледжаны прыклад паказвае, што трансфармацыя святочна-абрадавай культуры ў пасляваенны час не была аднанакіраванай. Яна ўяўляла сабой працэс, у якім традыцыйныя практыкі сутыкаліся з новай

---

[2] Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ). – Ф. 2926. Воп. 2. Спр. 28. – Л. 343.
[3] ДАВВ. – Ф. 2926. Воп. 2. Спр. 28. – Л. 377.
[4] Архіў Цэнтра вуснай гісторыі і палявых даследаванняў Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай (Архіў ЦВГ ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай). – Ф. 2. Воп. 7. Спр. 5.

нарматыўнай сістэмай, але апошняя яшчэ не была маналітнай: розныя інстытуцыі (міліцыя, пракуратура, калгасны сход) прапаноўвалі свае версіі рэакцыі. Вызваленне жанчыны ад адказнасці не азначала прызнання абраду легітымным, але сведчыла аб тым, што новая сістэма была вымушана адаптавацца да рэалій традыцыйнага грамадства, уносячы элементы гнуткасці ў правапрымяненне. Гэта адаптацыя была часткай больш шырокага працэсу савецкай мадэрнізацыі, якая закранала не толькі традыцыйны сялянскі спосаб гаспадарчых адносін, але і сямейныя каштоўнасці, механізмы сацыялізацыі і культурнай пераемнасці.

Калектывізацыя трансфармавала вытворчыя адносіны на сяле, змяніўшы традыцыйнае размеркаванне працоўных роляў, а разам з гэтым і сацыяльны статус жанчын. Дэмаграфічная сітуацыя пасля вайны істотна паўплывала на поларолевую ідэнтыфікацыю: дзяленне на "мужчынскія" і "жаночыя" прафесіі значна нівеліравалася, а недахоп кадраў вымушаў вылучаць жанчын на кіруючыя пасады ў сельсаветах і калгасах. Біяграфічныя наратывы пра пасляваенную рэчаіснасць таксама фіксуюць гэтую асаблівасць. Так, за Асвейшчынай у калектыўнай памяці насельніцтва рэгіёну замацавалася ўспрыманне яе, як "жаночая рэспубліка"[5], бо амаль усе ключавыя пасады займалі жанчыны, нават пасаду пракурора. Па меркаванні даследчыкаў, менавіта на пасляваенны перыяд прыпадае кардынальны слом традыцыйнай сельскай культуры, калі змяняюцца ўяўленні жанчын пра сваю сацыяльную ролю і месца ў сацыяльнай структуры [5, с. 193, 200]. Аднак у сферы сямейных адносін традыцыйныя ўяўленні захоўвалі ўстойлівасць, што стварала яшчэ адну зону канфлікту. Асаблівую вострасць гэты канфлікт набыў у сувязі з прыняццем Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 чэрвеня 1948 г. "Аб высяленні ў аддаленыя раёны краіны асоб, якія злосна ўхіляюцца ад працоўнай дзейнасці ў сельскай гаспадарцы і вядуць антыграмадскі паразітычны лад жыцця". Яго рэалізацыя на мясцовым узроўні сутыкнулася з супраціўленнем з боку тых сялян (пераважна мужчын-гаспадароў), для якіх традыцыйны сямейны ўклад прадугледжваў, што менавіта яны прымаюць рашэнні аб працы членаў сям'і. Гэта пацвярджаецца матэрыяламі калгасных сходаў. Так, у адным з выпадкаў брыгадзір калгаса, апаніруючы сакратару райкама, прывёў наступныя аргументы супраць селяніна: "…не участвует в колхозном труде и жене не разрешает. Я, как бригадир, дважды имел угрозы от него: "если будешь посылать жену на работу – я тебя убью!" Однажды его жене был дан наряд ночью сторожить колхозных свиней, она пришла домой, а он дверь замкнул и в дом ее не пустил – за то, что она пошла на колхозную работу"[6].

Адміністрацыйны ўплыў на сялянскую гаспадарку ў пасляваенны час не абмяжоўваўся канфліктамі вакол абрадавых практык або працоўнай дысцыпліны, ён закранаў і больш фундаментальныя асновы існавання. З пакон веку зямля звязвалася ў свядомасці селяніна з родам, вечнасцю, працу на зямлі вясковец лічыў самай значнай [1, с. 201]. А прымаючы да ўвагі складаную пасляваенную эканамічную рэчаіснасць, для некаторых яна была адзінай крыніцай жыццезабеспячэння. Імкненне захаваць і пашырыць зямельныя надзелы прыводзіла да практык, якія знаходзіліся на мяжы закону. Сярод іх – захоп калгаснай зямлі, які лічыўся сур'ёзным парушэннем сельскагаспадарчага статута, а таксама практыка ўяўных раздзелаў сем'яў, калі на паперы людзі былі разведзены, а на самой справе вялі сумесную гаспадарку і мелі прысядзібны ўчастак, разлічаны на двух "самотных" калгаснікаў. Гэта было характэрна як для сялян-аднаасобнікаў (дзе такая практыка дазваляла пазбегнуць занясення да катэгорыі кулакоў), так і для калгаснікаў (для якіх яна давала магчымасць атрымаць больш зямлі)[7]. Такія з'явы фіксуюць як матэрыялы палявых экспедыцый, так і дакументы органаў дзяржаўнай улады і кіравання – па выніках праверак разбазарвання грамадскай зямлі на карысць асабістых гаспадарак выяўляліся шматлікія выпадкі падобных парушэнняў.

Прымяненне карных мер за парушэнні землекарыстання было нераўнамерным і шмат у чым залежала ад пазіцыі калгаснага кіраўніцтва ўсіх узроўняў, якое, з'яўляючыся арганічнай часткай сельскага сацыуму, мела ўласнае разуменне тагачаснай жыццёвай сітуацыі. У адных раёнах за захоп калгаснай зямлі прыцягвалі да адказнасці ў масавым парадку, у іншых – нязначную колькасць сялян, нягледзячы на шматлікія выпадкі парушэнняў асноў калгаснага землекарыстання[8]. Гэтая нераўнамернасць фарміравала ў сялян розныя ўяўленні пра дапушчальнае і ступень рызыкі.

Дакументы справаводства органаў дзяржаўнай улады і кіравання фіксуюць выпадкі, калі рэакцыя на адміністрацыйныя меры набывала экстрэмальныя формы. Напрыклад, у Хоцімскім раёне Магілёўскай вобласці ў калгасніка вясной 1948 г. абрэзалі прысядзібны надзел за тое, што ён не выпрацаваў абавязковы мінімум працадзён. Пасля гэтага ён скончыў жыццё самагубствам. Прычым пазней гэта было прызнана памылкай[9]. Гэты выпадак выходзіць за межы простай эканамічнай матывацыі. У традыцыйнай сялянскай культуры прысядзібны надзел выконваў функцыі, якія не зводзіліся да гаспадарчага выкарыстання. Ён выступаў неад'емным элементам сістэмы жыццезабеспячэння, дзе матэрыяльны і сімвалічны аспекты былі цесна ўзаемазвязаны. Зямля вакол хаты ўспрымалася як працяг жыллёвай прасторы, як месца, якое забяспечвала не толькі фізічнае выжыванне, але і сацыяльную ідэнтыфікацыю гаспадара, яго сувязь з сям'ёй і грамадой. У гэтым кантэксце самагубства можа разглядацца як крайняя форма рэакцыі на разбурэнне традыцыйнай сістэмы каардынат, калі страта кантролю над уласнай гаспадарчай прасторай успрымалася як страта асновы існавання ў цэлым.

---

[5] Архіў ЦВГ ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай. – Ф. 2. Воп. 3. Спр. 2.
[6] Занальны дзяржаўны архіў горада Полацка. – Ф. 129. Воп. 8. Спр. 26. – Л. 16.
[7] ДАВВ. – Ф. 7. Воп. 1. Спр. 11.
[8] Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці. – Ф. 217. Воп. 7. Спр. 118. – Л. 145.
[9] Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці. – Ф. 9. Воп. 9. Спр. 171. – Л. 50.

**Заключэнне.** Прававыя навацыі 1947–1948 гг. былі накіраваны на ўніфікацыю сацыяльных паводзін. Заканадаўчыя акты гэтага перыяду прадугледжвалі крымінальную адказнасць не толькі за канкрэтныя дзеянні, але і за пэўны лад жыцця (ухіленне ад калгаснай працы). Аналіз судова-следчых матэрыялаў паказвае, што традыцыйныя нарматыўныя сістэмы – рэлігійна-абрадавыя практыкі, патрыярхальныя сямейныя адносіны і ўспрыманне зямлі як асновы жыцця – працягвалі рэгуляваць паводзіны сялян, уступаючы ў супярэчнасць з дзяржаўнымі прававымі нормамі. Пры гэтым трансфармацыя мела двухбаковы характар: дзяржава імкнулася падпарадкаваць традыцыю, а сяляне, у сваю чаргу, прыстасоўвалі звычаі да новых умоў, захоўваючы іх знешнюю форму (найбольш паказальны прыклад – адаптацыя абраду зажынак, калі сноп адносілі ў праўленне калгаса). Аднак такая адаптацыя адбывалася не ва ўсіх сферах: у выпадках, дзе закранаўся сямейны уклад (Указ 1948 г.) або статус зямлі (самагубства пасля скарачэння надзела), канфлікт заставаўся невырашаным.

Такім чынам, перыяд пасляваеннага аднаўлення ў беларускай вёсцы характарызаваўся супярэчнасцю паміж мэтамі дзяржаўнага будаўніцтва і сістэмай каштоўнасных арыенціраў мясцовай сялянскай супольнасці. Гэта супярэчнасць з'яўляецца знакавай рысай трансфармацыйных працэсаў і заслугоўвае далейшага даследавання ў кантэксце гістарычнай антрапалогіі і сацыяльнай гісторыі Беларусі.

## ЛІТАРАТУРА


1. Ходзін С.М. Беларуская вёска ў міжваенны час: шляхі і формы савецкай мадэрнізацыі (1921 – 1939). – Мінск : БДУ, 2014. – 240 с.
2. Без срока давности: Беларусь: Преступления нацистов и их пособников против мирного населения на оккупированной территории БССР в годы Великой Отечественной войны: Уничтожение нацистами белорусских деревень, 1941–1944 гг.: сб. архив. док. и материалов / сост.: В.Д. Селеменев (отв. сост.) [и др.]; редкол.: А.К. Демянюк (отв. ред.). – Минск: НАРБ, 2025. – 1200 с.
3. Без срока давности. Беларусь: преступления нацистов и их пособников против мирного населения на территории БССР в годы Великой Отечественной войны: документы и материалы / сост.: В.Д. Селеменев (рук.) [и др.]; редкол.: А.К. Демянюк (отв. ред.). – Минск: Беларусь, 2024. – 607 с.
4. Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі / В.Ф. Бацяеў, В.М. Бялявіна, А.У. Гурко і інш.; рэдкал.: В.М. Белявіна і інш.; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 616 с.
5. Хасянов О.Р. Повседневная жизнь советского крестьянства периода позднего сталинизма. 1945 – 1953 гг. – М.: Политическая энциклопедия, 2018. – 359 с.


*Паступіў 12.04.2026*

## КОНФЛИКТ ТРАДИЦИОННЫХ ПРАКТИК И ПРАВОВЫХ НОРМ В ПОСЛЕВОЕННОЙ БЕЛОРУССКОЙ ДЕРЕВНЕ (ПО МАТЕРИАЛАМ СУДЕБНЫХ ДЕЛ, КОЛХОЗНЫХ ПРОТОКОЛОВ И ЭТНОГРАФИЧЕСКИХ ИСТОЧНИКОВ)

***канд. ист. наук, доц. Е.В. СУМКО***
***(Полоцкий государственный университет имени Евфросинии Полоцкой)***

*На основе анализа судебных дел, колхозных протоколов и этнографических источников рассматриваются конфликты между традиционными практиками и правовыми нормами в послевоенной белорусской деревне. Источники свидетельствуют о неоднозначности квалификации одних и тех же действий крестьян на уровне колхозной общины и правоохранительных органов. Показано, что религиозно-обрядовые и патриархально-семейные практики продолжали регулировать поведение сельчан и вступали в противоречие с государственными правовыми новациями (Указы 1947–1948 гг.) в сферах землепользования, трудовой дисциплины и семейных отношений. Трансформация традиционной культуры рассматривается как процесс, в котором обычаи адаптировались к новым социально-экономическим условиям, сохраняя внешнюю форму.*

***Ключевые слова:*** *послевоенная деревня, правовое регулирование, традиционная культура, крестьянское мировоззрение.*

## THE CONFLICT BETWEEN CUSTOMARY PRACTICES AND LEGAL NORMS IN THE POST-WAR BELARUSIAN VILLAGE (BASED ON COURT RECORDS, COLLECTIVE FARM PROTOCOLS, AND ETHNOGRAPHIC SOURCES)

***A. SUMKO***
***(Euphrosyne Polotskaya State University of Polotsk)***

*The article examines conflicts between traditional customary practices and legal norms in the post-war Belarusian countryside, based on an analysis of court records, collective farm protocols, and ethnographic sources. The sources reveal an ambiguity in the qualification of identical peasant actions at the level of the collective farm community and law enforcement agencies. It is shown that religious-ritual and patriarchal-family practices continued to regulate the behaviour of rural residents and came into contradiction with state legal innovations (Decrees of 1947–1948) in the spheres of land use, labour discipline, and family relations. The transformation of traditional culture is considered as a process in which customs adapted to new socio-economic conditions while preserving their external form.*

***Keywords:*** *post-war village, legal regulation, traditional culture, peasant worldview.*